# Стратэгіі этнакоду: “адчуць крылы” або чакаць штуршка?

За “круглым сталом” “К”: пра ўрокі і перспектывы VI Рэспубліканскага фестывалю фальклорнага мастацтва “Берагіня” Тэма адраджэння, захавання і пераемнасці традыцыйнай культуры, праблемы этнавыхавання моладзі становяцца рэгулярнай нагодай для нашых публікацый. Стратэгія развіцця Рэспубліканскага фестывалю фальклорнага мастацтва “Берагіня”, канцэпцыі фарміравання асобы, выхаванай на традыцыях культуры, працэс захавання спадчыны ў сучасных умовах — такое праблемнае поле абмяркоўвалася за “круглым сталом” у рэдакцыі газеты “Культура”. У аналізе вынікаў “Берагіні” прынялі ўдзел намеснік міністра культуры Рэспублікі Беларусь, старшыня аргкамітэта фестывалю Тадэуш СТРУЖЭЦКІ; старшыня Нацыянальнай камісіі Рэспублікі Беларусь па справах UNESCO Уладзімір ШЧАСНЫ; аўтар ідэі “Берагіні”, навуковы і мастацкі кіраўнік фестывалю Мікалай КОЗЕНКА; старшыня Беларускага фонду культуры Уладзімір ГІЛЕП; прафесар культуралогіі Беларускага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта імя Максіма Танка Аляксей РАГУЛЯ; начальнік аддзела інавацыйных тэхналогій у сацыяльна-культурнай дзейнасці Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў Ала СТАШКЕВІЧ; балетмайстар-пастаноўшчык Беларускага дзяржаўнага заслужанага харэаграфічнага ансамбля “Харошкі”, дацэнт кафедры рэжысуры БДУКіМ Мікалай ДУДЧАНКА; намеснік дырэктара Нацыянальнага цэнтра мастацкай творчасці дзяцей і моладзі Кацярына КУЗЬМЕНКА; галоўны спецыяліст аддзела культуры Любанскага райвыканкама Сяргей ВЫСКВАРКА; намеснік дырэктара Вілейскай гімназіі № 2 Мінскай вобласці Мікалай ІВАНЕНКА; дырэктар Пратасевіцкай ДШМ Магілёўскай вобласці Наталля ЕЎДАКІМОВІЧ; галоўны дырэктар Дырэкцыі замежнага вяшчання Беларускага радыё Навум ГАЛЬПЯРОВІЧ; рэдактары аддзелаў газеты “Культура” Таццяна КОМАНАВА і Яўген РАГІН. Мерапрыемства, арганізаванае ў рамках прэзентацыі магчымасцей будучага Інфармацыйнага цэнтра на базе Рэдакцыйна-выдавецкай установы “Культура і мастацтва”, сабрала таксама прадстаўнікоў шэрагу друкаваных і электронных СМІ.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Тадэуш СТРУЖЭЦКІ:**



- На маю думку, кожны фестываль або іншы культурна-адукацыйны праект павінен завяршацца грунтоўным аналізам, што, на жаль, бывае не заўжды... Не сакрэт, што многія нашы форумы з'яўляюцца разавай культурна-творчай акцыяй, дзе відовішча- на першым месцы, а ідэя і змест- другасныя... Лічу, навукова-метадычнае суправаджэнне, прыцягненне дасведчаных кансультантаў робяць "Берагіню" адрознай ад іншых фэстаў, больш насычанай і цікавай. "Берагіня" - з'ява і прыклад для іншых, бо ёсць у ёй канцэпцыя, структура, комплекс навучальна-метадычных і асветніцкіх мерапрыемстваў, строга захоўваецца прынцып пераемнасці традыцыйнай культуры. І яна тут прадстаўлена не асобнымі элементамі, а ў комплексе: спеўнае, танцавальнае, музычнае, паэтычнае, абрадавае мастацтва, што мае лакальны адрасны характар.

**Яўген РАГІН:**

- Ці ўсе ідэі сёлетняй "Берагіні" ажыццёўлены?

**Тадэуш СТРУЖЭЦКІ:**

- Фестывальныя ідэі, на жаль, напоўніцу рэалізаваць пакуль не ўдалося: таму маецца шмат аб'ектыўных і суб'ектыўных прычын. Праект мае дакладную структуру і этапнасць, і асобныя пункты засталіся недасягальнымі. Да прыкладу, не здолелі правесці рэспубліканскі турнір у Горках, не змаглі зладзіць паўнавартасную навуковую канферэнцыю... Мы разглядаем фэст як форму папулярызацыі і прыцягнення ўвагі дзяржаўных органаў і арганізацый, навуковых і навучальных устаноў, СМІ да праблемы захавання і перадачы здабыткаў традыцыйнай культуры новым пакаленням. Яна - падмурак культуры сучаснай, якая фарміруе адметнасць і непаўторнасць Беларусі, нашу нацыянальную свядомасць. Калі сённяшнія нашы дзеці змогуць у пэўнай ступені далучыцца да нацыянальных традыцый, засвоіць іх, пераняць, дык заўтра, напэўна, яны іх прадоўжаць, а паслязаўтра - перададуць сваім дзецям. Задача ж тых, хто сабраўся за гэтым сталом, - спрыяць названаму працэсу. Большасць работнікаў культуры праблему разумее добра і працуе ў згаданым кірунку, але ў сістэме адукацыі нам хацелася б большага плёну, бо школа крыху адышла ад тых традыцый, што існавалі калісь цягам дзесяцігоддзяў. Паменшыўся цыкл эстэтычных дысцыплін, якія выкладаюцца, выпускнікі школ, на жаль, не маюць паўнавартасных фундаментальных ведаў, у тым ліку звязаных з традыцыйнай культурай Беларусі. Вакол гэтага і варта фарміраваць грамадскую думку.

**Яўген РАГІН:**

- Якім жа мусіць стаць наступны крок?

**Тадэуш СТРУЖЭЦКІ:**

- Глыбокае навуковае засваенне ведаў, навукова-метадычнае забеспячэнне практычных захадаў. Мы маем дзесяткі добрых прыкладаў, але не можам сцвярджаць, што сістэма працуе паўсюдна. Ёсць шэраг рэгіёнаў, дзе да праблемы ставяцца недаравальна павярхоўна, дзе традыцыйная культура ўспрымаецца як штосьці другаснае. Патрэбны комплекс мерапрыемстваў: навуковае абагульненне, даследаванне, выданне адпаведнай літаратуры, культурна-асветніцкія акцыі... Толькі такім чынам мы зможам далучыць да справы пераважную большасць спецыялістаў культуры, якія стануць акумуляваць ідэі і прыцягваць да супрацоўніцтва спецыялістаў з іншых сфер.

**Яўген РАГІН:**

- У нас шмат аўтэнтычных, так званых бабульчыных калектываў, дзейнічаюць пры іх і дзіцячыя гуртыспадарожнікі. Але іншым разам гэтыя ансамблі- штучныя, фармальныя, і пра пераемнасць традыцый тут казаць не выпадае... Выйсце бачыцца ў дзяржаўнай праграме па падтрымцы беларускай традыцыі...

**Тадэуш СТРУЖЭЦКІ:**

- У свой час была створана праграма падтрымкі традыцыйнай культуры, народнага мастацтва. Яна была рэалізавана не ў поўнай ступені, але, тым не менш, сам факт яе распрацоўкі даў добры штуршок: менавіта тады актывізавалася праца па стварэнні дамоў рамёстваў, павелічэнні колькасці фальклорных калектываў, аднаўленні забытых абрадаў... Так, фармалізм у захаванні і развіцці фальклору - не на карысць справе. І тут усё залежыць ад уплыву спецыялістаў культуры, што павінны дапамагаць, падказваць тым бабулям, носьбітам традыцый, як лепш арганізаваць работу па пераемнасці спадчыны. Яшчэ дваццаць гадоў таму ў нас былі дзесяткі майстроў, што выраблялі народныя інструменты.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Сёння іх засталіся адзінкі, пад пагрозай знікнення - традыцыя вырабу беларускага гармоніка і цымбалаў. Безумоўна, патрэбна адпаведная дзяржпраграма. Сёння яна распрацоўваецца.

**Яўген РАГІН:**

- І, згодна з ёй, "Берагіня", мусіць, павінна стаць сапраўднай рэспубліканскай лабараторыяй па ўсебаковым вывучэнні традыцый і па вызначэнні кірункаў яе развіцця...

**Тадэуш СТРУЖЭЦКІ:**

- Я ўпэўнены, што гэты фестываль павінен атрымаць большую падтрымку, у тым ліку і дзяржаўную. Мы гаворым пра адзін з эталонных форумаў у дадзенай сферы... Шкада, што сёння сярод нас няма прадстаўнікоў Міністэрства адукацыі... Перакананы: кожны наступны фестываль павінен ладзіцца з больш актыўным удзелам сістэмы адукацыі, бо тыя прыклады, што ў нас ёсць - тая ж Мётчынская школа, - павінны падштурхоўваць да развіцця і іншыя навучальныя ўстановы. Рэалізацыя праекта "Традыцыйная культура і дзеці" наўпрост уплывае на свядомасць школьнікаў, а ў выніку - на якасць іх навучання... Мы маем тут вельмі вялікі рэзерв для паглыблення зместу "Берагіні", пашырэння яе складу. Думаю, гэта агульная задача.

**Яўген РАГІН:**

- Сапраўды, міністэрствы культуры і адукацыі тут павінны выступаць як вельмі блізкія партнёры, зацікаўленыя ў адзіным выніку.

**Навум ГАЛЬПЯРОВІЧ:**



- Многія праграмы Беларускага радыё з даўніх часоў прапагандуюць наш фальклор, нашых народных майстроў... Паколькі ўзначальваю Дырэкцыю замежнага вяшчання Беларускага радыё, дык не магу не нагадаць, што пашырэнне аўтэнтыкі займае ў нашай дзейнасці выключна важнае месца, бо айчынная традыцыйная культура запатрабавана замежжам... Але не ўсе СМІ надаюць гэтаму пытанню належную ўвагу... Не магу не ўзгадаць, як я быў на радзіме - на Полаччыне - і выпадкова сустрэўся з фальклорным калектывам Палатоўскай сярэдняй школы, што якраз збіраўся на "Берагіню". Удзел у фальклорным калектыве станоўча паўплываў на навучанне хлопчыкаў і дзяўчат. Народныя строі і песні таксама фарміруюць асобу. Пра гэта і неабходна казаць прадстаўнікам СМІ. Праблема выхавання нацыянальнай годнасці ў дзяцей - адна з першарадных.

**Яўген РАГІН:**

- "К" пра гэта пісала і пісаць будзе. Як, зрэшты, і пра тое, што не ва ўсіх рэгіёнах Беларусі адназначна ўспрымаецца ўсеагульная карысць "Берагіні". Пра гэта сведчаць і арганізатары форуму...

**Мікалай КОЗЕНКА:**



- Часам дакументы, што рэгламентуюць правядзенне фестывалю, зацвярджаюцца вельмі позна, нават тады, калі "Берагіня" ўжо ідзе. А былі выпадкі, што форум скончыўся - і толькі тады дакументы атрымалі сілу. А

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

варта ўсё рабіць загадзя, і прыкладам тут - сістэмная падрыхтоўка да Фестывалю нацыянальных культур... Хацеў бы ўзняць і праблему кадраў. Сёння ў нас няма спецыялістаў, якія здолелі б прафесійна кіраваць дзейнасцю аўтэнтычных калектываў. Скажам, маюцца толькі два выпускі этнафоназнаўства ва Універсітэце культуры. Гэта ўсяго каля дзесятка чалавек, і надвор'я яны, пагадзіцеся, не зробяць. А такой спецыяльнасці трэба навучаць, пачынаючы з сярэдняй спецыяльнай установы.



**Наталля ЕЎДАКІМОВІЧ:**

- У Інстытуце павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў БДУКіМ ёсць спецыяльныя курсы. Я сама ў свой час скончыла Універсітэт культуры, вельмі цікаўлюся фальклорам і шукала на гэтых курсах такую спецыяльнасць, але мне прапанавалі толькі эстрадны вакал... Ведаю, ахвотных павысіць кваліфікацыю ў сферы фальклору, этнафоназнаўства - шмат, але курсы тыя падобны запыт задаволіць пакуль не могуць.

**Тадэуш СТРУЖЭЦКІ:**

- Праблема кадраў існавала, існуе і будзе існаваць. Мы маем пэўную колькасць спецыялістаў, якія сапраўды плённа працуюць на месцах і ў абласных цэнтрах, і ў асобных раёнах. Але, безумоўна, гэта кропля ў моры. Падрыхтаваць вузкапрофільных спецыялістаў вельмі складана. Больш выніковы шлях - перападрыхтоўка кадраў: дырэктараў дамоў культуры, метадычных цэнтраў. Яны маюць базавую падрыхтоўку, але спецыяльных ведаў не стае, і вось тут, думаю, павінен сыграць сваю ролю не толькі Інстытут павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў (вы ведаеце, што цяпер падрыхтаваны ўсе дакументы па стварэнні больш самастойнай установы, дзе будуць сакумуляваны практычна ўсе функцыі, якія выконваў Інстытут праблем культуры, плюс некаторыя дадатковыя). Калі нам удасца рэалізаваць запланаванае, дык мы здолеем наладзіць паўнацэнную сістэму не толькі павышэння кваліфікацыі, але і перападрыхтоўкі... Ёсць спецыяліст у раёне - і справы ідуць. "Берагіня" гэта ярка паказвае. Няма спецыяліста - рэгіён застаецца белай плямай на карце нашага вялікага культурнага праекта.

**Мікалай КОЗЕНКА:**

- На сёння ў школах мастацтваў працуе больш за 60 працэнтаў выкладчыкаў, якія не маюць педагагічнай кваліфікацыі. У мяне такая прапанова: адкрыць на базе ІПКіПК перападрыхтоўку кадраў з атрыманнем псіхолага-педагагічнага сертыфіката.

**Таццяна КОМАНАВА:**

- Хацелася б, каб мы пагутарылі і пра дзяцей. На першых фестывалях асноўнай задачай "Берагіні" было сабраць дзяцей і прывезці іх да бабуль, дзядуль - носьбітаў традыцыі. Сёння ўжо многія з іх сышлі з жыцця, і тыя дзеці, што бралі ўдзел у першых "Берагінях", - самі носьбіты нашай культуры. Як засвоенае імі шырэй уводзіць у практычнае жыццё? Вельмі не хацелася б, каб усё заставалася тэатралізаванай забаўкай, што ладзіцца раз на год-два...

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ



**Сяргей ВЫСКВАРКА:**

- У нас у калектыве такой праблемы проста няма, бо пераемнасць існуе, а ў мяне ўжо чацвёртае пакаленне такіх выхаванцаў расце... Праблему бачу ў іншым: у нас - недастатковае ўзаемадзеянне паміж адукацыяй і культурай на ўзроўні нават дырэктара сельскага Дома культуры і дырэктара сельскай школы. Няма распрацаваных і дакладных агульных праграм па развіцці традыцыі... Спецыялісты ў нас ёсць, але яны заняты іншымі справамі. У СДК працуюць адзін-два чалавекі, і на фальклор часу іншым разам проста не стае. Таму і варта сістэму працы з традыцыйнай культурай вылучыць у асобную праграму і ў адукацыі, і ў культуры. На практыцы, на жаль, усё выглядае інакш...

**Ала СТАШКЕВІЧ:**



- Наспеў час выпрацаваць пэўную стратэгію па захаванні культуры. Паколькі Беларусь адной з першых падпісала Канвенцыю UNESCO аб захаванні культурнай спадчыны 2003 года, дык выпрацоўка стратэгіі- абавязковы, лагічны і неадкладны крок. У Канвенцыі вызначаны тры асноўныя моманты захавання спадчыны: выяўленне, дакументаванне, забеспячэнне жыццядзейнасці нематэрыяльнай спадчыны. Стварэнне механізма самаадраджэння традыцыйнай культуры - надзвычай складаная з'ява, бо ўключае мноства аспектаў: адукацыю, папулярызацыю лепшых напрацовак па захаванні спадчыны. Між тым, у UNESCO сёння ёсць Рэгістр лепшых сусветных практык па захаванні нематэрыяльнай культурнай спадчыны. "Берагіня" - адзін з узораў найлепшых практык сусветнага маштабу. Фестываль павінен быць у тым рэгістры, каб міжнародная супольнасць далучылася да яго, што пашырыць межы форуму і паспрыяе развіццю культурнага турызму. Але асноўнае - стварыць стратэгію па аднаўленні і захаванні спадчыны.

**Таццяна КОМАНАВА:**

- Любая ініцыятыва павінна мець пэўную падтрымку. Дасведчаны практык, перш чым увайсці ў міжнародны кантэкст, запытаецца: "А якая мне ад гэтага карысць?" Ці можна на традыцыйнай культуры зарабляць і выконваць план платных паслуг?

**Уладзімір ШЧАСНЫ:**



- Зарабляць можна, але не заўжды для гэтага ёсць і жаданне, і рэальныя магчымасці... Нам трэба звярнуць увагу на захаванне менавіта рэгіянальных культурных асаблівасцей. Многія з нашых народных фестываляў "грашаць" на імітацыю народнасці... Што да захавання спадчыны... Гэты працэс - не выключна яе архівізацыя. Наадварот, усё трэба пакідаць калі не ў сельскім клубе, дык у мясцовым музеі і раіць работнікам культуры ў паўсядзённай дзейнасці звяртаць увагу на асаблівасці ўласнай народнай культуры. Другое: каб заахвоціць носьбітаў нашай культуры, варта, на мой погляд, выдаваць ім адпаведныя пасведчанні, сертыфікаты. Гэта дадавала б гонару іх працы. Трэцяе: неабходна стварыць, як, да прыкладу, у Чэхіі, сайт, што змяшчаў бы інфармацыю аб тым, дзе жывуць і працуюць носьбіты традыцый культуры, якой творчасцю займаюцца, каб любы ахвотны мог знайсці ў Інтэрнеце адрас, тэлефон разьбяра або ткачыхі і замовіць іхні твор. Вось вам і план платных паслуг...

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Навум ГАЛЬПЯРОВІЧ:**

- Некалі я прыехаў у вёску Слабодка Браслаўскага раёна: там жыў майстар Пятро Карэннік, які вырабляў саламяныя брылі. Амаль ніхто пра яго не ведаў, а пасля рэпартажу на Беларускім радыё да яго пачалі звяртацца з усёй Беларусі. Сайт з інфармацыяй пра носьбітаў традыцыйнай культуры можа сапраўды прынесці вялікую карысць, дапамагчы з платнымі паслугамі.

**Ала СТАШКЕВІЧ**:

- Але перш чым рабіць сайт, трэба стварыць дзеючы інвентар па ўсёй рэспубліцы...

**Мікалай ІВАНЕНКА:**

- Па сутнасці, у раёнах ён існуе. Ёсць метадычныя цэнтры, якія сабралі інфармацыю. Але кожны працуе сам па сабе.

**Сяргей ВЫСКВАРКА:**

- Патрэбна проста аб'яднаць тое, што ёсць. Але мы ўсе, паўтаруся, займаемся сваімі справамі, нам не стае часу.

**Уладзімір ШЧАСНЫ:**

- Мы спрабуем атрымаць фінансаванне на стварэнне такога сайта ад UNESCO. Гэта немалыя грошы.

**Аляксей РАГУЛЯ:**



- У словах Алы Барысаўны прагучаў тэрмін "стратэгія". Гэта значыць, што, хочам таго ці не, мы сталі на шлях паяднання лакальных духоўных і сацыяльных каштоўнасцей з агульнай праграмай самасцвярджэння нацыі ў свеце. Тут трэба дзейнічаць так, каб праца была арыентавана на вялікі гуманістычны сэнс, закладзены ў народнай культуры. Таму прапаноўваю стварыць пры фестывалі камісію, якая аб'яднае групу тэарэтыкаў, што будуць займацца праблематыкай народнай культуры ў сучасным культурным працэсе. Першая праблема: народная культура і стаўленне моладзі да яе. Варты ўвагі феномен суб'екта - носьбіта і творцы. Многіх непакоіць, што дзіця павінна і спяваць, і танцаваць, і вышываць, і граць на музычным інструменце. Маўляў, для моладзі гэта складана. Але гаворка ідзе пра комплексны характар засваення спадчыны.

**Мікалай КОЗЕНКА:**

- Трэба акрэсліць канцэптуальна, у чым сэнс форуму "Берагіня". Гэта не фестываль у фестывалі, а - фестываль у традыцыйнай культуры. Ён - вынік працы па навучанні дзяцей. Яны да заключных мерапрыемстваў "Берагіні" павінны паўдзельнічаць у шмат якіх праграмах. Самы ж галоўны этап - на мясцовым узроўні: у сям'і, школе, клубе, бо менавіта тут ідзе вывучэнне, даследаванне розных праяў традыцыйнай культуры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Уладзімір ШЧАСНЫ:**

- Раней праявы мясцовай культуры перадаваліся дзецям ад бацькоў, дзядоў. Сёння такую ролю выконваюць спецыялісты, і бачна, што справа ідзе горш. Апошняе не можа не хваляваць. Яны не павінны насаджаць культуру дзецям - педагогам трэба заахвочваць і каардынаваць справу.

**Ала СТАШКЕВІЧ:**

- Але без спецыялістаў уявіць такую дзейнасць немагчыма, бо механізм перадачы традыцыі ў сям'і страчаны на 90 працэнтаў.

**Мікалай КОЗЕНКА:**

- Шмат можа зрабіць, зноў жа паўтаруся, сістэма адукацыі. Я наведваў школу ў Швецыі, выпускнікі якой ведаюць не менш за 400 песень кожны! І таму ў іх праблемы камунікацыі няма. У канцэпцыі мінулай "Берагіні" мы напісалі, што з раніцы да вечара дзеці павінны самавыяўляцца. А на практыцы: калі не падштурхнеш - нічога не адбываецца. У гэтым сэнсе дзеці і падлеткі яшчэ не навучаны паказваць сябе.



**Мікалай ІВАНЕНКА:**

- Заўважу пра адукацыю ў этнашколе. Я больш за дзесяць гадоў займаўся такім навучаннем. Спачатку гэта быў рэспубліканскі эксперымент. Усё занатоўваецца, фіксуецца, адбываюцца грунтоўныя размовы ў метадычных аб'яднаннях, на педагагічных саветах: усё запісана і пакуль што не страчана. У нас - велізарны матэрыял, які можна выкарыстоўваць, сабраць у агульнарэспубліканскую скарбонку і працягваць працу. Я паназіраў: дзеці ў гімназіі пад час навучальнага года чатыры разы на тыдзень маюць у раскладзе ўрок замежнай мовы, могуць таксама браць факультатывы. А на беларускую мову - толькі адна гадзіна...

**Таццяна КОМАНАВА:**

- Вы закранулі вельмі важнае пытанне - папулярызацыі народнай культуры не ў сэнсе "памнажэння" яе носьбітаў або ўмельцаў, якія танцуюць, плятуць паясы. Калі б мы больш па тэлебачанні бачылі этнапраграм, вядома, больш людзей паважалі б традыцыйную культуру. Пад час сваіх камандзіровак у рэгіёны, на канцэртах фальклорных выканаўцаў нярэдка чула: "Няўжо вы з самога Мінска прыехалі, спецыяльна, каб нас паслухаць?"...



**Уладзімір ГІЛЕП:**

- З гэтай нагоды я прапанаваў бы, пры падтрымцы Міністэрства культуры, пры зацікаўленасці Міністэрства адукацыі і Камісіі па справах UNESCO, правесці сур'ёзную міжнародную канферэнцыю па захаванні этнакультурнай адметнасці. Нам патрэбна дапамога дзяржавы, навукоўцаў, практыкаў.

**Мікалай КОЗЕНКА:**

- Вопыт выкладчыкаў этнашкол з розных рэгіёнаў краіны, працу калектываў добра было б вывучыць і педагогам Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў, Беларускага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта імя Максіма Танка...

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Ала СТАШКЕВІЧ:**

- Стратэгія, якая аб'яднае розныя ўстановы культуры, міністэрствы, установы адукацыі, павінна адным з раздзелаў мець таксама выпрацоўку эканамічнага механізма стымулявання жыццядзейнасці элементаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны. Без такой матывацыі, - колькі б мы ні гаварылі, колькі б ні рабілі энтузіясты сваю справу, - нічога не будзе. Механізм складаецца з розных аспектаў, у тым ліку з развіцця культурнага турызму. Добра было б мець такую турыстычную карту, на якой былі б пазначаны ўсе мясціны, дзе захавалася падобнага кшталту спадчына, або, зноў такі, інтэрнет-рэсурс. Той жа абрад "Цары" ўвайшоў сёння ў многія даведнікі, у тым ліку ў даведнік UNESCO. Далучыцца да справы маглі б міністэрствы эканомікі, спорту і турызму. Дарэчы, такая стратэгія ёсць у Чэхіі, Венгрыі, сёння яе распрацавала Эстонія, гэта вельмі цікавы досвед. У апошняй краіне гэты працэс ідзе знізу, рэгіёны цягам некалькіх гадоў праводзяць такую палітыку, яны эксперыментуюць, адпрацоўваюць складаныя моманты.

**Сяргей ВЫСКВАРКА:**

- Нам і нашаму раёну "Берагіня" дала крылы. І гэта не метафара, а праўда. Шмат чаго ў раёне рабілася даўно, і тое, што Любаншчына "гучыць", - заслуга многіх нашых спецыялістаў. Але калі мы першы раз з'явіліся на "Берагіні" з аўтэнтычным гуртом, і эксперты сказалі, што гэта - цікава і годна, мы пачалі працаваць інакш: рабіць упор не на колькасць, а на якасць. Хачу ўзгадаць Васіля Ліцвінку з яго перадачай "Запрашаем на вячоркі" (нягледзячы на многія хібы, яна ў свой час зрабіла вельмі вялікую справу). Чаму ў нас сёння існуюць аўтэнтычныя гурты? Таму, што ў свой час мы мелі магчымасць выступаць з імі на тэлебачанні. Ці ёсць сёння на айчынных тэлеканалах перадача, хаця б аддалена падобная да той, усім нам вядомай? Наш калектыў прывозіць Гранпры з фестывалю, але хто ў краіне, акрамя нас саміх, пра гэта ведае? Чаму мы стараемся вывозіць нашы гурты на выступленні ці то за мяжу, ці нават проста ў суседні раён? Таму што гэта дае падставы для людзей, якія жадаюць спяваць, далучацца да нас. Вось я трымаю ў руках даведнік па абрадзе "Цары" і перажываю супярэчлівыя пачуцці: цудоўна, што ён ёсць, але шкада, што змог пабачыць яго толькі за гэтым сталом. А добра было б, каб ён быў даступны ў кожным раёне, для максімальна вялікай колькасці людзей, каб існавала "мода" на традыцыйную культуру: тады не спатрэбяцца і дадатковыя фінансавыя ўліванні. Прыкладам, што зрабілі шведы? На падставе ўласных традыцый яны стварылі так званы сучасны шведскі стыль, які выяўляецца ў паводзінах, адзенні, інтэр'ерах і ва ўсіх іншых праявах жыцця. Вось было б нядрэнна, каб гэтак жа стварыўся, выкрышталізаваўся і сучасны беларускі стыль.

**Навум ГАЛЬПЯРОВІЧ:**

- Для таго, каб зрабіць традыцыйную культуру, як вы кажаце, моднай, трэба распрацаваць стратэгію работы з прэсай. А то мы, людзі, якія гэтым займаюцца, самі сябе ўгаворваем, а далей гэтага справа нікуды не ідзе. А з прэсай трэба працаваць, бо журналісты не заўсёды ведаюць, што дзе адбываецца. Адкуль мы будзем атрымліваць гэтую інфармацыю, як не ад вас?

**Наталля ЕЎДАКІМОВІЧ:**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

- Ад імя нашай Дзіцячай школы мастацтваў хачу падзякаваць "Берагіні" і яе арганізатарам за той досвед, які мы атрымалі, дзякуючы ўдзелу ў фестывальным руху. Мы - адна з многіх устаноў, дзе вывучаецца сусветная музычная культура і вельмі мала ўвагі надаецца нацыянальнай. У сувязі з гэтым, хацелася б, каб у школах мастацтваў былі адкрыты фальклорныя аддзяленні. Асабліва актуальна гэта ў вёсках, у аграгарадках: там, калі мы прыязджаем са сваімі традыцыйнымі праграмамі, бачым, што для мясцовых дзяцей гэта - натуральны асяродак культуры. А дзякуючы "Берагіні" мы ўключылі ў фестывальны рух усе, нават самыя аддаленыя, нашы філіялы. І сёння дзеці на дыскатэках з задавальненнем танчаць пад народную музыку і просяць даць ім дыск з аўтэнтычнымі запісамі. А хлопцы, гледзячы на вышываныя сарочкі, кажуць: "Прыгожа, я б такую насіў". Падлічыце, колькі ў нас у рэспубліцы школ мастацтваў, і калі б была магчымасць адкрываць у іх фальклорныя аддзяленні, як шмат дзяцей мы выхавалі б ў рэчышчы традыцыйнай культуры!

**Аляксей РАГУЛЯ:**

- У вас жа, пэўна, ёсць спецыяльная дысцыпліна - "Беларуская культура"?

**Наталля ЕЎДАКІМОВІЧ:**

- Не, асобна такой дысцыпліны няма. Ёсць "Беларуская музыка", што выкладаецца толькі ў пятым класе і толькі паўгадзіны на тыдзень.

**Сяргей ВЫСКВАРКА:**

- Дарэчы, у Міханавіцкай школе мастацтваў працуе фальклорнае аддзяленне, якое стварыла Ларыса Рыжкова і доўгі час ім кіравала. Там была свая створаная і апрабаваная праграма. І я ведаю, што гэта - не адзінкавы вопыт.

**Наталля ЕЎДАКІМОВІЧ:**

- Але ж усе гэтыя праграмы зацверджаны на мясцовым - раённым або абласным - узроўні. Да таго ж, яны - часовыя: разлічаны на тры-пяць гадоў, а потым завяршаюцца, "знікаюць"...



**Мікалай ДУДЧАНКА:**

- 10 гадоў таму я працаваў у паўднёвакарэйскім Сеуле, дзе ствараў праграму ў адным з лепшых у свеце Шаратон-тэатры. Праграма складалася з двух аддзяленняў, і першае прэзентавала нацыянальнае карэйскае мастацтва. Надзвычай высокі ўзровень прэзентацыі, як з тэхнічнага боку, так і з выканальніцкага! Аказалася, што карэйцы не "саромеюцца" дэманстраваць сваю культуру на самым высокім узроўні, устаўляць яе элементы ў шоу-праграмы. І гэта не адзінкавы выпадак: нацыянальная праграма на мерапрыемствах любога ўзроўню у іх - на першым месцы. Колькі гадоў запар на "Славянскім базары ў Віцебску" мы - Беларусь, Расія, Украіна - ламаем галовы, як падаць свой нацыянальны дзень. І кожны раз усе нашы спробы правальваюцца ў бяздонную яму зза адсутнасці дакладна акрэсленай ідэі. І акурат зараз мне падумалася: у нас жа шмат цікавых, яркіх фестываляў, сярод якіх - і "Берагіня", і Рэспубліканскі фестываль нацыянальных культур, і многія іншыя. Дык чаму б не зрабіць на "Славянскім базары..." Дзень Беларусі або яго частку ў выглядзе прэзентацыі лепшых узораў нашых нацыянальных фестываляў? На маю думку, сёння, як ніколі, традыцыйная народная

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

культура павінна быць такім жа самым паўнапраўным прадметам, які і іншыя дысцыпліны школьнай праграмы. Гэта і ўзровень нашай нацыянальнай самасвядомасці.

**Сяргей ВЫСКВАРКА:**

- Давайце проста прадэманструем грамадству, што наша - не горшае, а, можа, нават у нечым і лепшае. Іншая справа, што за ўсю гісторыю "Берагіні" я не памятаю ніводнага выпадку, каб калектыўпераможца атрымаў дзякуючы гэтаму магчымасць выехаць на якісьці прэстыжны фестываль за мяжу. І яшчэ. Даўно, не сёння, адбылася падмена такіх паняццяў, як "фальклор" і "фальклорнае мастацтва", хаця гэта абсалютна розныя, цалкам самастойныя з'явы. Прыкладам, "Харошкі" - цудоўны калектыў, якім я асабіста вельмі захапляюся, але ж ён вельмі мала мае дачынення да сапраўднага фальклору.

**Мікалай ДУДЧАНКА:**

- У яго задача - іншая.

**Сяргей ВЫСКВАРКА:**

- Менавіта так! І я, у адрозненне ад простага "спажыўца", гэта цудоўна разумею. Але прытым, што існаваць павінны і адны, і другія, у большасці сваёй наш абывацель не заўсёды бачыць, наколькі розныя задачы ў хору Цітовіча і ў фальклорнага хору вёскі Ананчыцы, у фальклорнага ансамбля з вёскі Сарачы і ў "Харошак". Мы пакуль што не патлумачылі для яго гэтую розніцу.

**Кацярына КУЗЬМЕНЬКА:**



- Як прадстаўнік сферы адукацыі і Дзіцячага цэнтра мастацкай творчасці, хачу сказаць, што ў нас надаецца шмат увагі праблемам захавання і развіцця нацыянальных традыцый. У нас у свой час адбывалася станаўленне этна-гурта "Троіца" Івана Кірчука, плённа працавалі Таццяна Пладунова і Вячаслаў Калацэй, Мікола Козенка... Як установа адукацыі мы таксама праводзім свой конкурс дзіцячых фальклорных калектываў пад назвай "Веснавы танок". Вядома, што існуе пэўны падзел паміж сферамі адукацыі або культуры. Пад час першага нашага фестывалю, скажам, было шмат калектываў, што існуюць пры ўстановах культуры, а вось на апошнім "Веснавым танку" абышліся толькі сіламі ўстаноў адукацыі. Разумею, што гэта і не вельмі добра - "дзяліць" традыцыйную культуру згодна з яе адміністратыўнай "прыналежнасцю", але ж у абарону магу сказаць: сферы адукацыі таксама хочацца, каб у нас існавалі яркія, цікавыя ансамблі, якія займаюцца засваеннем фальклорных традыцый. І "Берагіня" нам у гэтым вельмі дапамагла: сёння мы паказваем не проста сцэнічны вынік работы, але і вынік комплекснага этнакультурнага выхавання і захавання народных традыцый.

**Тадэуш СТРУЖЭЦКІ:**

- За гэтым сталом прагучала шмат цікавых і вартых увагі думак. Але ж на ідэі мы ніколі не былі бедныя. Іншая справа, што калі б хаця некаторыя з іх мы маглі рэалізаваць, справа, безумоўна, зрушылася б з месца. Цалкам згодны з тым, што нам сёння патрэбна асобная

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

праграма падтрымкі традыцыйнай культуры. Вопыт у нас такі ёсць, і неўзабаве, калі будзе прынята Дзяржаўная праграма развіцця культуры, яе лагічным працягам якраз і можа стаць міжгаліновая праграма падтрымкі традыцыйнай культуры.

Што да падрыхтоўкі спецыялістаў, я асабіста лічу, што гэтая праблема цалкам вырашальная ў межах тых магчымасцей і рэсурсаў, якія на сённяшні дзень існуюць. Іншая справа, што нярэдка даводзіцца сутыкацца з недастатковым разуменнем праблем і задач. Згадайма, да прыкладу, сітуацыю, якая склалася ў мінулым годзе ва Універсітэце культуры, калі там вырашылі ліквідаваць спецыялізацыю "Беларускія народныя духавыя інструменты". Мы вымушаны былі сесці за стол, пачаць размаўляць з кіраўніцтвам універсітэта, і ў выніку прыйшлі да разумення: такі крок проста нельга рабіць. Бо для Універсітэта культуры акурат гэта - асноўная, эксклюзіўная ніша, дзякуючы якой ён будзе падтрымліваць свой імідж і сярод сённяшніх, і сярод будучых абітурыентаў. Не бачу асаблівых праблем з увядзеннем фальклорных аддзяленняў у музычных школах, гэтаксама як з этнашколамі і школамі традыцыйнай культуры. Галоўнае - каб былі ініцыятыўныя людзі і спецыялісты ў сваёй справе. А вучні, упэўнены, знойдуцца, і - у дастатковай колькасці.

Вельмі слушная заўвага - адносна грунтоўнага сайта традыцыйнай народнай культуры з картай, фотаздымкамі і відэаінфармацыяй, кантактнымі данымі: яго даўно трэба было стварыць, але, як кажуць, лепей позна, чым ніколі. Не адкрыю таямніцы, што культурны турызм - тая "залатая жыла", якая сёння яшчэ не раскрыта. І яна можа быць добрым стымулам: калі мясцовы калектыў стане запатрабаваным, а да яго далучацца нацыянальная кухня, камфортны начлег і ўвесь спектр турпаслуг, многія з задавальненнем пакінуць свае грошы ў тым або іншым рэгіёне.

Таксама слушная прапанова - аб статусе носьбітаў народнай культуры: я думаю, гэта можна будзе ажыццявіць ужо ў хуткім часе. Тым больш, што сёння мы ўручаем падобныя пасведчанні народным майстрам. Ды і ідэя ўнясення "Берагіні" ў Рэгістр лепшых сусветных практык таксама можа стаць важным крокам у папулярызацыі не толькі самога фестывалю, але і беларускай нацыянальнай культуры ўвогуле.

Дарэчы, калі казаць пра работу з аб'ектамі нематэрыяльнай спадчыны, тут галоўнае - каб людзі адчувалі патрэбу і падтрымку. Не трэба наўмысна ўмешвацца ў гэтыя працэсы. Мы ж, у сваю чаргу, павінны стварыць вакол іх пастаяннае поле зацікаўленасці, пра што мы неаднойчы гаварылі. У сувязі з гэтым хачу яшчэ раз закцэнтаваць увагу на тым, на што прысутныя не раз "намякалі", - на праблеме асвятлення традыцыйнай культуры ў СМІ. Калі ў тым або іншым выданні альбо на тэлеканале маецца дасведчаны, неабыякавы да народнай культуры журналіст, можна не сумнявацца: ён знойдзе магчымасці і форму для адпаведнага асвятлення той ці іншай унікальнай з'явы. А што, калі такога журналіста няма? Тут мусіць быць выпрацавана сістэма работы з прэсай: для таго, каб максімальна поўна і адпаведна данесці інфармацыю да людзей. І калі СМІ не вельмі спяшаюцца з "абдымкамі", то варта самім парупіцца пра крокі насустрач. Думаю, у дачыненні да "Берагіні" варта было б падумаць аб больш шырокай прэзентацыі фестывалю ў Мінску: каб прыцягнуць увагу ўсіх тых, хто з самых розных прычын "не даязджае" да Акцябрскага. Сюды ж можна далучыць і Міжнародную канферэнцыю па праблемах традыцыйнай культуры, і гэта цалкам рэальна было б зрабіць ужо наступным годам, не адкладваючы справу ў доўгую скрыню.

Нікога з нас, прысутных тут, не трэба пераконваць у карысці ды неабходнасці "Берагіні" і традыцыйнай народнай культуры ўвогуле. Але калі кожны з нас "сагітуе" хаця б па тры-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пяць чалавек, а тыя, у сваю чаргу, - таксама, - толькі тады можна разлічваць, што кола неабыякавых і зацікаўленых людзей будзе пастаянна шырыцца.

**Фота Юрыя ІВАНОВА**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ